■ Размова па сутнасці

# З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА АЙЧЫНА?

**Усе мы родам з малой радзімы. У кожнага ёсць куток, дзе адпачывае сэрца, куды неадступна вяртаюцца думкі. Што трэба рабіць, каб умацаваць дабрабыт родных горада, мястэчка, вёскі? Ці патрэбны нашы высілкі тым мясцінам, дзе мы нарадзіліся? На гэтыя і многія іншыя пытанні шукалі адказу падчас круглага стала «Вывучэнне малой радзімы: вопыт, праблематыка, перспектывы». Ён прайшоў у межах XXII Міжнароднай спецыялізаванай выставы «СМІ ў Беларусі» і па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі быў арганізаваны сумесна газетай «Звязда» і «Настаўніцкай газетай».**

— Любоў да малой радзімы — гэта галоўнае, пра што варта казаць, вядучы размову пра патрыятычнае выхаванне. Не так даўно газета «Звязда» сумесна з Беларускім фондам культуры ладзілі круглы стол, прысвечаны Году малой радзімы, дзе акрэслілі многія важныя аспекты гэтай тэмы, — адзначыў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ.** — Усе мы выйшлі з малой радзімы. Для кагосьці Мінск — гэта малая радзіма. Але для большасці з нас, для нашых бацькоў — гэта маленькі куточак любімай Беларусі, які заўсёды чакае нас. Сам я з Мастоў, там жыве і з радасцю сустракае мяне матуля. І я ёй час ад часу кажу, што выспацца, добра адпачыць я магу толькі там. Там ні пра што не хвалюешся і можаш сапраўды разняволіцца... Таму ўвага да малой радзімы — гэта не даніна пэўнай модзе — гэта тое, што сапраўды ёсць у нашых сэрцах.

**Вадзім КНЫШАЎ, галоўны рэдактар «Настаўніцкай газеты»,** паразважаў пра важнасць працы тых настаўнікаў, якія рупліва шчыруюць над тым, каб укласці ў сэрцы сваіх вучняў любоў да таго месца, дзе яны нарадзіліся, жаданне клапаціцца і стварыць нешта добрае на гэтым карысць:

— Краязнаўства, этнаграфія, культура малой радзімы — гэта часткі вялікай Радзімы, якой мы прысвячаем не толькі сваё прафесійнае, але і прыватнае жыццё... Варта адзначыць, што вельмі актыўна працуе адукацыйнае краязнаўства. Нашы педагогі шмат укладваюць у выхаванне сваіх вучняў, фарміруюць патрыятызм і любоў, без якой немагчыма будаваць ні сучасную, ні будучую Беларусь.

Цікава было пачуць, што краязнаўства, не будучы абавязковым кірункам для працы ў школе, усё адно ахапіла большасць навучальных устаноў. Заўсёды знаходзіўся апантаны настаўнік, арганізатар, гатовы даследаваць з вучнямі іх радзіму. **Загадчык аддзела краязнаўства і патрыятычнага выхавання Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Аляксандра КРАВЕЦ** расказала пра сістэму краязнаўчай работы ва ўстановах адукацыі краіны:

— У навучальных установах нашай краіны ўжо даўно наладжана сістэмная краязнаўчая работа. Мы заўсёды падчас сустрэчы з краязнаўцамі з розных рэгіёнаў краіны даносім думку, што для таго, каб убачыць плён нашай дзейнасці, павінна быць доўгатэрміновая праца. Распачалася наша краязнаўчая работа яшчэ ў 1992 годзе, калі была прапавана ўсебеларуская турысцка-краязнаўчая добраахвотная экспедыцыя, якая называлася «Наш край». У межах гэтай экспедыцыі былі выпрацаваны далейшыя кірункі дзейнасці. А затым, ужо ў 2006 годзе, у Крычаве быў дадзены старт акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Можна сказаць, што гэта акцыя дагэтуль крочыць па краіне. Працуюць аб'яднанні па інтарэсах, праводзяцца рэгіянальныя акцыі, праекты, конкурсы, у якіх удзельнічаюць амаль усе надзённа ў іх рэгіёне. Паколькі гэта гістарычныя работы, мы арыентуем іх скіроўваць увагу на гісторыю малой радзімы. Напрыклад, адна студэнтка пісала дыплом пра сваю малую радзіму Малое Мажэйкава — і яе праца аказалася вельмі запатрабаванай у роднай вёсцы. Мы рыхтуем настаўнікаў гісторыі. Пасля яны працуюць у тым ліку ў школьных музеях, якія ёсць ва ўсіх установах адукацыі — і акурат там таксама праводзіцца актыўная краязнаўчая работа, бо музеям патрэбна развіццё.

**Ірына ДУБЕЙКА, настаўніца гісторыі і грамадазнаўства Жамчужненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна** уласныя краязнаўчыя росшукі ўвасобіла ў дзве кнігі:

— Асабіста я зацікавілася тэмай Першай сусветнай вайны і ў сваіх пошуках часта карысталася інтэрнэтрэсурсамі. Віртуальнае сеціва дапамагло мне знайсці ўнікальнае паве-




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Злева направа: галоўны рэдактар «Настаўніцкай газеты» Вадзім КНЫШАЎ, рэдактар аддзела праблем выхавання «Настаўніцкай газеты» Ігар ГРЭЧКА, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ.

школы, гімназіі і ліцэі. Праводзяцца пошукавыя акцыі, арыентаваныя непасрэдна на даследаванне малой радзімы, яе малавядомыя аб'екты і гісторыка-культурныя каштоўнасці. Я лічу, што Год малой радзімы скіраваны на даследаванне сябе — праз краязнаўства да беларусазнаўства.

**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксей ЗАГІДУЛІН** падзяліўся досведам краязнаўчай работы ў вышэйшай навучальнай установе:

— Мы таксама займаемся краязнаўствам праз работу са студэнтамі і вучнямі і прытрымліваемся практыка-арыентаванага навучання. Студэнты выконваюць курсавыя работы, дыпломы, арыентуючыся на тое, што дамленне англійскага карэспандэнта газеты «Times», у якім распавядалася кранальная гісторыя выратавання афіцэра, якая адбывалася акурат на нашых землях. Шмат было знойдзена ў сецыве фотаздымкаў герояў і апісанняў іх подзвігаў. Такія росшукі вылiліся ў напісанне дзвюх кніг. Адна з іх прысвечана Першай сусветнай вайне, другая —трагедыі, якая адбывалася пад Баранавічамі ў 1941 годзе.

Адметна, што тэма Года малой радзімы выклікала бурную дыскусію на круглым стале, што ладзіўся на выставе СМІ. Кожнаму хацелася выказаць, як ён бачыць краязнаўчую работу, на што трэба ў першую чаргу скіраваць увагу, як перафарматаваць працу і куды варта прыкласці асноўныя высілкі... Як бачым, тэма жывая і надзённая. І важна, што грамадству яна не абыякавая.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Спорт-тайм

# «РОСТ ЧАСТА ІДЗЕ ПРАЗ БОЛЬ»

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра галоўныя спартыўныя падзеі выхадных.**

***1. Зборная Беларусі з паражэнняў стартавала на чэмпіянаце свету па хакеі ў Даніі.*** У дэбютным матчы нашы хакеісты прайгралі дзеючаму чэмпіёну свету зборнай Швецыі — 0:5, а ў другой сустрэчы пацярпелі паражэнне ад французаў 2:6.




*— Вядома, такога выніку не чакаў. Дэбют правялі дастаткова сабрана, але потым нешта пайшло не так,* — каментуе вынікі **галоўны трэнер зборнай Беларусі Дэйв Льюіс.** — *Мы занадта часта прайгравалі адзінаборствы «сам-насам». Калі абаронца ў адзіночку не можа даць рады з адным форвардам, сістэма не можа працаваць. Яна працуе, толькі калі кожны паспяхова выконвае сваю ролю. Многія гульцы яшчэ занадта маладыя, а моладзі ўласціва памыляцца. І прымацьгэта блізка да сэрца. Цяпер сваю ролю павінны адыграць нашы лідары. Не толькі на лёдзе, але і па-за яго межамі. Трэба разумець спецыфіку гэтага турніру: па падборы выканаўцаў ён мацнейшы за нядаўнюю Алімпіяду. Гэта ў тым ліку меркаванне спецыялістаў, якія наведвалі Пхёнчхан і працуюць у НХЛ. Нельга адмаўляць, што цяпер у нас вялікі шанс згубіць месца ў эліце. На жаль, няма крамы, у якую можна прыйсці і ўзяць для зборнай сталых майстроў. Рост часта ідзе праз боль,* — адзначыў галоўны трэнер.

***2. Дзесяць медалёў заваявалі беларускія барцы на чэмпіянаце Еўропы ў расійскім Каспійску.*** Ірына Курачкіна заваявала «золата» ў катэгорыі да 55 кг, сярэбранымі прызёрамі сталі Ванеса Каладзінская (53 кг), Анастасія Зімянкова (да 72 кг), трэцяе месца кантынентальнага форуму занялі Вераніка Іванова (62 кг), Крысціна Федарашка (65 кг) і Васіліса Марзалюк (76 кг). Сярод барцоў-вольнікаў Аляксандр Гуштын (97 кг) дайшоў да фіналу і стаў уладальнікам сярэбранай узнагароды, Уладзіслаў Андрэеў (57 кг) завяршыў выступленне з бронзавай узнагародай. У спаборніцтвах барцоў класічнага стылю Віктар Сасуноўскі (82 кг) заваяваў сярэбраны медаль, а ў заключны дзень турніру ў катэгорыі да 74 кг Андрэй Карпач стаў бронзавым прызёрам.

***3. Завяршыліся матчы 6-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Сталічнае «Дынама» і салігорскі «Шахцёр» згулялі ўнічыю — 0:0. Брэсцкае «Дынама» пацярпела другое паражэнне, саступіўшы «Тарпеда-БелАЗ» з лікам 0:2, «Слуцк» перайграў «Смалявічы» — 1:0, «Тарпеда» саступіў футбольнаму клубу «Прамень» — 0:1, «Гарадзея» і «Гомель» не змаглі выявіць пераможцу — 0:0, «Віцебск» перайграў «Мінск» — 1:0, «Іслач» саступіла «Нёману» — 1:2.

***4. Вікторыя Азаранка паспяхова пачала выступленне на турніры катэгорыі «Прэм'ер» у Мадрыдзе.*** У стартавым паядынку яна перамагла 52-ю ракетку свету сербку Аляксандру Круніч — 6:3, 6:3.

Вікторыя адзначыла, што ў наступныя два месяцы таксама плануе прыняць удзел у турнірах у Рыме, Парыжы, на Мальёрцы і «Уімблдоне».

Дарэчы, упершыню за 17 гадоў у топ-100 сусветнага рэйтынга аказаліся адразу 4 беларускія тэнісісткі. Арына Сабаленка (№ 46), Аляксандра Сасновіч (№ 58), Вера Лапко (№ 92) і Вікторыя Азаранка (№ 98).

***5. Ілья Шымановіч абнавіў нацыянальны рэкорд на 50 м брасам на чэмпіянаце Беларусі па плаванні ў Брэсце.*** Спартсмен на 0,04 сек палепшыў сваё ж нацыянальнае дасягненне. Гэты вынік з'яўляецца кваліфікацыйным на чэмпіянат свету 2019 года ў Кванджу (Рэспубліка Карэя), таксама час Шымановіча ў фінале — гэта трэцяе месца ў Еўропе ў бягучым сезоне.

Для Шымановіча гэта ўжо другі рэкорд на чэмпіянаце Беларусі, раней ён усталяваў новае дасягненне на дыстанцыі 100 м брасам — 59,40 сек.

Таксама адзначым, што юнацкі нацыянальны рэкорд на дыстанцыі 50 м на спіне абнавіла Анастасія Шкурдай. Ранейшы вынік (28,63 сек) яна перасягнула на 0,14 сек — 28,49 сек.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Будзь у курсе!

## Авіялінію будуць эксплуатаваць сумесна

ААТ «Авіякампанія «Белавія» і нацыянальны перавозчык Турцыі — Turkish Airlines — падпісалі двухбаковае пагадненне аб сумеснай эксплуатацыі авіялініі (код-шэрынг) Мінск — Стамбул. Паводле пагаднення аб сумеснай камерцыйнай эксплуатацыі вышэйназванай лініі абедзве кампаніі атрымаюць права свабодных продажаў на рэйсы адна адной па маршруце Мінск — Стамбул — Мінск.

Зараз кожная з авіякампаній ажыццяўляе па пяць рэйсаў на тыдзень з Мінска ў Стамбул і назад. З 1 мая ўсе рэйсы паміж Мінскам і Стамбулам двух авіяперавозчыкаў стануць сумеснымі. Дзякуючы дагавору пасажыры атрымаюць больш варыянтаў і магчымасцяў для падарожжаў, а таксама змогуць скарыстацца найбольш зручнымі стыкоўкамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**